

Брыгадзір 1-га ўчастка Марына БЕЗБАРОДЗЬКА праводзіць на полі ўвесь дзень.



Раіса БОЙКА, начальнік цэха перапрацоўкі збожжа, на таку правярае ўраджай на вільготнасць.



Абеды ад Валянціны СЯРЧЭНІ механізатары з'ядаюць з апетытам.

# Залучаныя на жніве

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дзевяць камбайнерскіх экіпажаў зранку да прыцемкаў шчыруюць на рапсавых, з трыцікале, пшанічных і ячных палетках. Пажнуць адну культуру — перабіраюцца на іншую — спелую, густую, пад цяжкімі каласамі — ніву. Пакуль надвор'е спрыяе, механізатары не расслабляюцца, не адпачываюць, не трацяць ні хвіліны (хіба толькі на гарачы і смачны полудзень, вядома ж, пад адкрытым небам). Хутка набіраюцца сямітонныя бункеры, увішныя «МАЗы» і «газончыкі» падстаўляюць свае кузавы пад «хлебны» дождж. Збожжа транспартуецца з поля на ток, а на двары зернесушылкі ўтвараецца сапраўдная «горная сістэма».

Можна шмат расказваць пра кожнага ўдзельніка ўраджайнай бітвы на лучнікоўскіх палетках — механізатараў і вадзіцеляў, супрацоўнікаў МНС і раздатчыкаў абедаў, аграномаў і брыгадзіраў участкаў, работнікаў зернятока... — усе яны сумленна працуюць у сёлетняй уборачнай кампаніі...

Галоўны аграном Сяргей Савановіч раскрыў агранамічныя карты (цяпер можна): азімая пшаніца пасеяна на тысячы ста чатырнаццаці гектарах, азімы трыцікале — на трохсот дваццаці гектарах, рапс — на сямісот трыццаці...

— Сёлета рапс нас не падвёў: на трыццаць працэнтаў большы ўрадзіўся, чым леташні, а азімы ячмень дае 75 цэнтнераў на круг, — кажа агранам Сяргей Савановіч.

Перад тым як вярстаўся газетны нумар, я патэлефанаваў галоўнаму аграному і пачуў ад яго: «Наша жніво ўжо на самым экватары і амаль усе экіпажы наблізіліся, а то і перасягнулі тысячны рубеж».

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**(Больш здымкаў з ААТ «Аграфірма «Лучнікі» глядзіце на сайце «Звязды».)**



Камбайнер Аляксандр КЛЕВАНОВІЧ першы ў гаспадарцы намалаціў сваю тысячу тон. А серп яму патрэбен, каб даставаць асцё з жаткі камбайна.



Сваё трыццаціпяцігоддзе вадзіцель Сяргей СІДАРОК адзначае на жніўным полі.



Так утвараюцца хлебныя «горы».